**Сяргей Панізьнік: 95 год з дня нараджэння сп. Вольгі Грыцук**

Пра гэты юбілей сп. Вольгі Грыцук, найстарэйшага сябра ЗБК, нагадаў сп. С. Панізьнік. Як ён напісаў “9 кастрычніка 2018 года спаўняецца 95 гадоў ад нараджэння Вольгі, дачкі Васіля з роду Дуброўскіх - спадарыні Грыцук. Будзем памятаць мы, - не забудуць і нас...”.




Рэдакцыя часопіса “Культура. Нацыя” цалкам згодна са сп. Панізьнікам, аб тым, што мы мусім з цеплынёй і любоўю ставіцца адзін да аднаго, і яшчэ ў большай ступені да нашых ветэранаў, якія паклалі шмат сіл для падтрымкі беларускасці ў замежжы. Мы зычым сп. В. Грыцук усяго найлепшага. Ніжэй падаём копію пісьма, напісанае сп. В. Грыцук да сп. С. Панізьніка, з нагоды яе 90-годдзя.

*КУЛЬТУРА, НАЦЫЯ, №22, лістапад 2018* *ISSN 2291-4757*

Kingston, 20. 11. 2013

Вельмі паважаны сп. Сяргей Панізьнік!

Ад шчырага сэрца дзякую Вам за увагу аддадзеную маёй асобе з маім 90-годзьдзям з дня нараджэньня. Сардэчна Вам дзякую за прысьвечаны для мяне вельмі прыгожы верш, а таксама за напісаныя артыкулы у газэтах „Жыве Беларусь на чужыне“ і Мёрская дайніна, а таксама у рускамоўнай газэце у Чыкага“. Вельмі мне спадабаўся з цудоўнымі малюнкамі, мастацкія творы у „Пошукаx Атлянтыды“. Усе гэтыя мясьціны ёсьць для мяне родныя і дарагія.

Мой юбілей 90-годдзя быў для мяне вельмі прыгожым і прыемным. Радасную неспадзяванку зрабілі мне сябры З.Б.К. з Таронта. Прыехала старшыня З.Б.К спадарыня Валя Шаўчэнка з мужам Юрам, сп. Віялета Кавалёва і яшчэ адна спадарыня, новая эмігрантка, толькі на жаль я не магу прыпомніць яе прозьвішча.

2

Прывезьлі яны мне прыгожы букет з бел-чырвона-белых ружаў. Таксама перадалі мне верш напісаны ад спадарыні Вольгі Ігнатавай. Пару дзён пазьней я атрымала з Беластока 6 номераў газэты „Ніва", у якой быў зьмешчаны артыкул сп. Сяргея Чыгрына пра мяне. Цяя гэта падзея вельмі мяне расчуліла і я глыбока ў маёй душы схавала. Незабуду я ніколі, аж да канца майго жыцьця.

Дарагенькі спадар Сяргей! Шчыра Вам дзякую за усё, што Вы сваім учынкам так цёпла і прыгожа памаглі мне адсьвяткаваць мой юбілей.

З прывітаньнем і найлепшымі пажаданьнямі для Вас і Сям'і.

З глыбокай пашанай

Вольга Грыцук